стых классов играет ключевую роль в их физическом, психологическом и общем благополучии. Профилактические меры, направленные на развитие навыков здорового образа жизни, включают в себя регулярные физические упражнения, сбалансированное питание, ограничение времени за экранами гаджетов, а также правильный режим сна. Эти меры способствуют укреплению здоровья, повышению иммунитета, улучшению физической формы и эмоционального состояния учащихся.

1.Медико-педагогические условия формирования здорового образа жизни учащихся в школе / И. М. Прищепа [и др.] // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава. – 2016. – № 3. – С. 108–112.
2.Прищепа, И.М. Здоровье и ты / И.М. Прищепа. – Витебск : УО «ВГУ имени П.М. Машерова», 2007 – 90 с.

## ФАРМІРАВАННЕ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ЦІКАВАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ РАЗДЗЕЛА “СКЛАД СЛОВА” ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ ЗАЙМАЛЬНЫХ ЗАДАННЯЎ

***Паціявец М.А.,***
*студэнтка 4 курса БрДУ імя А.С. Пушкіна, г. Брэст, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Канцавая Г.М., канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Пазнавальная цікавасць, малодшыя школьнікі, займальны матэрыял, раздзел “Склад слова”.
Keywords. Cognitive interest, younger students, interesting material, section “Syntax”.

Пазнавальная цікавасць з’яўляецца рухаючай сілай працэсу навучання і пазнання, з прычыны чаго спрыяе фарміраванню глыбокіх і трывалых ведаў. Вучні з высокім узроўнем развіцця пазнавальнай цікавасці здольныя даходзіць да ісціны самастойна, а таксама праяўляюць любоў і цікавасць да вывучэння школьных прадметаў, у іх выяўлена жаданне вучыцца і шмат ведаць.

Найважнейшым сродкам фарміравання пазнавальнай цікавасці малодшых школьнікаў з’яўляюцца займальныя заданні. Займальнасць звязана з цікавымі бакамі рэчаў, з’яў, працэсаў, якія ўздзейнічаюць на вучня. У гэтай прыродзе займальнасці заключаны надзвычай значныя для пазнавальнай цікавасці элементы, якія могуць выклікаць пачуццё здзіўлення, якое з’яўляецца пачаткам працэсу пазнання.

Мэта працы – выяўленне ўзроўню матывацыі пазнавальнай цікавасці малодшых школьнікаў пры вывучэнні раздзела «Склад слова», распрацоўка і правядзенне ўрокаў з выкарыстаннем займальных заданняў.

**Матэрыял і метады.** Метады даследавання ўключаюць аналіз псіхолага-педагагічнай літаратуры, метад педагагічнага назірання за навучальным працэсам, педагагічны эксперымент, колькасны і якасны аналіз дыягнастычных дадзеных. Даследаванне праводзілася на базе ДУА “Пачатковая школа № 10 г. Кобрына”. У якасці рэспандэнтаў выступілі вучні 3 “Б” класа.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Паводле Г.І. Шчукінай, пазнавальная цікавасць – гэта “выбарчая скіраванасць асобы, звернутая да вобласці пазнання, да яе прадметнага боку і самога працэсу авалодання ведамі” [1, С. 193]. Н.Р. Марозава разумее пад пазнавальнай цікавасцю “эмацыянальна-пазнавальныя адносіны да прадмета або рэчаіснасці, якія пераходзяць у накіраванасць асобы» [2, С. 109], а І.Ф. Харламаў – “пачуццёва афарбаваную патрэбнасць, што прайшла стадыю матывацыі, якая надае дзейнасці чалавека займальны характар” [3, С. 18].

На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі школьнікі пачынаюць вывучаць раздзел “Склад слова”, тэмы якога цяжкія для малодшых школьнікаў, так як прадугледжваюць наяўнасць у дзяцей малодшага школьнага ўзросту дастаткова развітага абстрактнага мыслення, умення назіраць за фактамі мовы, свядома рабіць вывады, а значыць, і мала цікавыя.

Для развіцця ў малодшых школьнікаў пазнавальнай цікавасці да вывучэння раздзела "Склад слова" неабходна ўключаць ва ўрокі заданні займальнага характару, што адрозніваюцца навізной, незвычайнасцю, нечаканасцю, эмацыянальнасцю, і галоўнае, яны цікавыя малодшым школьнікам, што выклікае ў іх станоўчыя адносіны да вывучаемага матэрыялу.

Пры дапамозе анкеты "Выяўленне ўзроўню матывацыі пазнавальнай цікавасці" Н.Р. Лусканавай пасля ацэнкі адказаў вучняў намі было выяўлена, што нізкая матывацыя пераважае ў 49 % вучняў, сярэдні ўзровень матывацыі ў 36 % дзяцей, толькі ў 15 % апытаных вучняў пераважае высокая матывацыя пазнавальнай цікавасці. Гэтыя школьнікі праяўляюць цікавасць, самастойнасць і ініцыятыву пры вырашэнні пазнавальнай задачы.

Праведзеная намі дыягностыка паказала, на якім узроўні развіцця вучэбна-пазнавальнай цікавасці знаходзяцца трэцякласнікі. Пасля правядзення дыягностыкі намі былі прааналізаваны тэмы па раздзеле "Склад слова" і падабраны займальны матэрыял, які можна выкарыстоўваць на ўроках беларускай мовы з мэтай развіцця пазнавальнай цікавасці.

Выкарыстанне займальнага матэрыялу пры вывучэнні раздзела "Склад слова" паказала цікавасць малодшых школьнікаў да новых ведаў, якая выяўлялася ў жаданні выконваць прапанаваныя настаўнікам заданні. Паколькі заданні былі прадстаўлены ў займальнай форме, малодшым школьнікам было цікава запамінаць інфармацыю па вывучаемай тэме.

Пасля праведзеных урокаў мы паўторна прадыягнаставалі вучняў трэцяга класа, выкарыстаўшы тую ж анкету, што і на канстатуючым этапе эксперымента. Па выніках дыягностыкі па анкеце "Выяўленне ўзроўню матывацыі пазнавальнай цікавасці" (Н.Р. Лусканава) сабраны наступныя дадзеныя: у 24 % дзяцей выяўлены высокі ўзровень, сярэдняе значэнне ў 52 % вучняў, а ў 24 % трэцякласнікаў нізкі ўзровень матывацыі пазнавальнай цікавасці.

**Заключэнне.** Такім чынам, распрацаваныя і апрабаваныя падчас даследавання ўрокі па раздзеле "Склад слова" дазволілі павысіць узровень развіцця вучэбна-пазнавальнай цікавасці ў вучняў трэцяга класа, што было пацверджана эксперыментальным даследаваннем. Пазнавальная цікавасць да тэм раздзела "Склад слова" садзейнічала развіццю ў малодшых школьнікаў інтэлектуальных уменняў аналізу, сінтэзу, параўнання, супастаўлення, класіфікацыі, абагульнення.

1. Щукина, Г.И. Проблема познавательного интереса в психологии / Г.И. Щукина. – М.: Просвещение, 2006. – 382 с.
2. Морозова, Н.Г. Учителю о познавательном интересе / Н.Г. Щукина. – М.: Знание, 2016. – 246 с.
3. Харламов, И.Ф. Педагогика : учеб. пособие для вузов / И.Ф. Харламов. – М. : Гардарики, 1999. – 520 с.

## ТВОРЧЕСКОЕ РАЗВИТИЕ ДЕТЕЙ ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА ЧЕРЕЗ ЗАНЯТИЯ ЛЕПКОЙ

***Пахноцкая П.И.,***
*студентка 2 курса ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель – Щепеткова Н.В., канд. пед. наук*

Ключевые слова. Лепка, детское изобразительное творчество, дошкольное образование, начальное образование.

Keywords. Modeling, children's visual arts, preschool education, primary education.

Лепка – это уникальный вид детской изобразительной деятельности, который предоставляет детям возможность создавать скульптуры из мягких материалов. Этот вид творчества доступен для занятий в детских садах, школах и кружках, и он имеет значительное влияние на развитие детей. Нами рассматривается потенциал лепки из глины и пластилина как метода обучения, способного формировать интеллектуальные способности, расширять художественный кругозор и развивать творческий подход к окружающему миру у детей любого возраста. Одним из преимуществ лепки является ее простота в освоении, что делает этот вид творчества доступным для всех возрастных категорий.